Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар
УА «Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
_______________ Ю.П. Бондар
«___» ___________ 2013 г.
Рэгістрацыйны № ВД- ___/вуч.

# ПРАГРАМА
# ВУЧЭБНАЙ І ВЫТВОРЧАЙ ПРАКТЫКІ

*па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць,*
*напрамку 1-18 01 01-05 Фальклор,*
*спецыялізацый 1-18 01 01-05 01 Абрадазнаўства*
*і 1-18 01 01-05 02 Этнафоназнаўства*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2013

**Складальнікі:**

*Т. А. Пладунова*, старшы выкладчык кафедры этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;

*А. А. Гулак*, старшы выкладчык кафедры этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат філалагічных навук

**Рэцэнзенты:**

*Т. Б. Варфаламеева*, вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі, кандыдат мастацтвазнаўства;

*А. М. Нароўская*, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат гістарычных навук

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

*кафедрай* этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 30.06.2012 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 24.09.2012 г.)

Адказны за рэдакцыю *В. Б. Кудласевіч*

Адказныя за выпуск *Т. А. Пладунова, А. А. Гулак*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Практыка (фальклорная, азнаямленчая, вытворчая, педагагічная, пераддыпломная) з'яўляецца неад'емнай часткай працэсу падрыхтоўкі спецыялістаў па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць, напрамку 1-18 01 01-05 Фальклор. Практыка скіравана на замацаванне ў вытворчых умовах ведаў і ўменняў, атрыманых у працэсе навучання ў ВНУ, авалоданне навыкамі вырашэння прафесійных задач, навыкамі сацыяльнай камунікацыі, вытворчымі тэхналогіямі. Яна праводзіцца ва ўстановах культуры (цэнтрах народнай творчасці, дамах культуры, архівах, музеях і іншых арганізацыях), адукацыі (сярэдніх спецыяльных навучальных установах, школах з мастацкатворчым ухілам, школах мастацтваў), пазашкольнага навучання і выхавання (цэнтрах творчасці дзяцей і моладзі).

*Мэты практыкі:*

– замацаванне ў практычнай дзейнасці тэарэтычных ведаў і прафесійных уменняў і навыкаў, набытых у працэсе навучання;

– выхаванне ў студэнтаў цікавасці да прафесійнай дзейнасці, творчых адносін да арганізацыі работы ў аўтэнтычных, аматарскіх і дзіцячых фальклорных калектывах.

*Задачы практыкі:*

– авалоданне метадамі палявой і мастацкай фалькларыстыкі (фіксацыі музычнага і вусна-паэтычнага фальклору ў этнасацыяльным кантэксце; класіфікацыі, сістэматызацыі фальклорных твораў і іх архівацыі; мастацкай рэканструкцыі фальклорнай практыкі ў аматарскай творчасці);

– азнаямленне з работай сучасных устаноў сацыякультурнай сферы: іх структурай, планаваннем і дакументаваннем; функцыянальнымі абавязкамі адміністратыўнага, вытворчага і педагагічнага корпуса; зместам, кірункамі дзейнасці, метадамі работы фальклорных калектываў; традыцыямі і навацыямі ў арганізацыі работы сацыякультурных устаноў па захаванні і трансляцыі традыцыйнай беларускай культуры;

– авалоданне метадамі кіравання вучэбна-выхаваўчым працэсам у аматарскіх фальклорных аб'яднаннях;

– фарміраванне навыкаў узаемаадносін паміж людзьмі рознага ўзросту, сацыяльнага статусу падчас арганізацыі аматарскай творчасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Арганізацыя кіраўніцтва практыкай** ускладаецца на кафедру этналогіі і фальклору, якая выконвае наступныя функцыі:

– распрацоўвае праграмы, неабходныя дакументы ў адпаведнасці з палажэннем па практыцы факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва;

– прызначае кіраўнікоў практыкі, размяркоўвае паміж імі студэнтаў-практыкантаў;

– дамаўляецца з базамі практыкі аб накіраванні на іх студэнтаў і ўмовах праходжання практыкі, за 10 дзён да пачатку правядзення практыкі забяспечвае кантроль і праверку гатоўнасці кожнай базы і азнаямленне кіраўнікоў баз практыкі з праграмнымі патрабаваннямі ўсяго аб'ёму заданняў для студэнтаў;

– адказвае за выкананне заданняў па практыцы ў адпаведнасці з зацверджанымі планамі і праграмамі;

– забяспечвае падрыхтоўку і зацвярджае справаздачы, падрыхтаваныя адказным кіраўніком практыкі;

– праводзіць дыферэнцаваны залік па выніках практыкі.

**Матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне практыкі.** Для паспяховага правядзення практыкі акадэмічная група (або іншае падраздзяленне) у межах наяўных тэхнічных магчымасцей і вылучаных бюджэтных сродкаў можа забяспечвацца аўдыя-, відэазапісваючай і гукаўзнаўляючай апаратурай, фотаапаратурай, партатыўным камп'ютарам, расходнымі матэрыяламі ў колькасці, неабходнай для выканання мэт і задач практыкі.

**Фінансаванне практыкі.** Практыка фінансуецца за кошт бюджэтных сродкаў, якія выдзяляюцца ВНУ на яе правядзенне, а таксама пазабюджэтных сродкаў (спонсарскай дапамогі, мэтавых грантаў) у адпаведнасці з нарматывамі на аплачванне камандзіровачных выдаткаў, арэнду транспарту, набыццё расходных матэрыялаў, аплату паслуг мясцовых арганізацый і сувязі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ПРАКТЫКІ

## Першы курс
## Вучэбная практыка (фальклорная)

**І. Агульныя палажэнні.** Фальклорная практыка скіравана на азнаямленне студэнтаў са святочна-абрадавымі комплексамі беларусаў у розных гісторыка-культурных рэгіёнах Беларусі. Яна праводзіцца ў другім семестры ў форме экспедыцыі ў тыя раёны Беларусі, у якіх да нашых дзён захаваліся абрадавыя святы ў аўтэнтычнай форме. На запіс фальклорных твораў ва ўмовах практыкі адводзіцца не менш за 30 гадзін, астатні час студэнты займаюцца расшыфроўкай аўдыязапісаў і падрыхтоўкай матэрыялаў да архіўнага захавання, афармляюць дзённікі практыкі.

**ІІ. Мэты і задачы практыкі:** азнаямленне студэнтаў з аўтэнтычным бытаваннем музычнай і вусна-паэтычнай спадчыны беларусаў; засваенне методыкі палявой фіксацыі твораў фальклору ў этнасацыяльным кантэксце; актуалізацыя тэарэтычных ведаў, атрыманых у межах дысцыплін «Беларускі фальклор», «Беларускі народны каляндар», «Тэорыя фальклору»; набыццё практычных навыкаў запісу, класіфікацыі і сістэматызацыі фальклорных твораў; папаўненне фальклорнага архіва кафедры.

**ІІІ. Базы практыкі:** аддзелы культуры Полацкага, Лепельскага, Расонскага, Ушацкага раёнаў Віцебскай вобласці; Ваўкавыскага, Смаргонскага, Дзятлаўскага, Шчучынскага раёнаў Гродзенскай вобласці; Кобрынскага, Драгічынскага, Лунінецкага, Пінскага, Іванаўскага, Маларыцкага раёнаў Брэсцкай вобласці; Лельчыцкага, Жыткавіцкага, Мазырскага, Акцябрскага, Рэчыцкага, Веткаўскага, Чачэрскага раёнаў Гомельскай вобласці; Асіповіцкага, Клімавіцкага, Рагачоўскага, Клічаўскага, Мсціслаўскага, Бялыніцкага, Хоцімскага раёнаў Магілёўскай вобласці; Барысаўскага, Салігорскага, Любанскага, Старадарожскага раёнаў Мінскай вобласці.

**ІV. Справаздачнасць** прадугледжвае аўдыя-, відэа- і фотафіксацыю традыцыйных абрадаў, песенных і празаічных жанраў фальклору, афармленне дзённіка фальклорнай практыкі, расшыфроўку запісаных фальклорных адзінак (тэксты, этнафанічныя транскрыпцыі песень).

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

Другі курс

**Вучэбная практыка (азнаямленчая)**

**I. Агульныя палажэнні.** Азнаямленчая практыка праводзіцца ў чацвёртым семестры без адрыву ад вучэбнага працэсу. Яна прадугледжвае азнаямленне з працай устаноў культуры па вывучэнні і трансляцыі традыцыйнай культуры (фальклорныя архівы, метадычныя цэнтры, цэнтры народнай творчасці і дамы фальклору, цэнтры культуры і пазашкольнага выхавання); практычнае вывучэнне фальклорнай традыцыі ва ўмовах, набліжаных да жывога бытавання, а таксама падчас сустрэч з носьбітамі (рэпетыцыя, канцэрт фальклорна-этнаграфічнага гурту, свята ці фестываль аўтэнтычнага фальклору); тэарэтычны аналіз творчай дзейнасці калектываў розных тыпаў фальклорызму, якія засвойваюць і актуалізуюць фальклорныя традыцыі рэгіёнаў.

**II. Мэты і задачы практыкі:** азнаямленне з работай сучасных устаноў сацыякультурнай сферы: іх структурай, планаваннем і дакументаваннем, функцыянальнымі абавязкамі адміністратыўнага, вытворчага і педагагічнага корпуса, зместам, кірункамі дзейнасці, метадамі работы фальклорных калектываў, традыцыямі і навацыямі ў арганізацыі работы сацыякультурных устаноў па захаванні і трансляцыі традыцыйнай беларускай культуры.

**III. Базы практыкі:** размешчаныя ў Мінску і Мінскім раёне ўстановы культуры (музеі і цэнтры народнай культуры, архівы), установы адукацыі (сярэднія адукацыйныя школы, школы мастацтваў, установы дадатковай адукацыі), творчыя саюзы і грамадскія аб’яднанні па вывучэнні культурнай спадчыны Беларусі.

**IV. Справаздачнасць** прадугледжвае афармленне дзённіка і пісьмовай справаздачы па выніках азнаямленчай практыкі.

Трэці курс

**Вытворчая практыка (архіўная / сцэнічная)**

Вытворчая практыка праводзіцца ў шостым семестры на працягу васьмі тыдняў без адрыву ад вучэбнага працэсу і скіравана на вывучэнне вопыту работы ўстаноў культуры ці ўстаноў адукацыі. Вытворчая практыка на спецыялізацыях

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Абрадазнаўства» і «Этнафоназнаўства» мае сваю спецыфіку (архіўная/сцэнічная), адлюстраваную ў наступных профільных праграмах.

## Праграма вытворчай (архіўнай) практыкі для студэнтаў спецыялізацыі «Абрадазнаўства»

**I. Агульныя палажэнні.** Архіўная практыка скіравана на актуалізацыю тэарэтычных ведаў, атрыманых у межах шэрагу дысцыплін (этналогія, фальклор, гісторыя фалькларыстыкі, этнасеміётыка і інш.). Важнейшымі састаўляючымі яе з'яўляюцца фарміраванне навыкаў збірання, папаўнення і захавання фальклорнага архіва, авалодванне ўменнямі архіўнай каталагізацыі з выкарыстаннем сучасных інфармацыйных тэхналогій, развіццё эўрыстычных навыкаў, набытых студэнтамі ў вучэбным працэсе.

**II. Мэты і задачы практыкі:** азнаямленне з прынцыпамі і формамі каталагізацыі, стварэння фондаў, інструкцыямі па ўліку і захаванні архіўных матэрыялаў; сістэмамі захавання фальклорных калекцый у архівах; рэжымамі аховы фондаў, палажэннем аб карыстанні архіўнымі матэрыяламі ў навуковых мэтах; набыццё ўменняў выкарыстання архіўных матэрыялаў у самастойных навуковых даследаваннях.

**III. Базы практыкі:** Нацыянальная бібліятэка Беларусі: фонд рукапісаў, старадрукаў і рэдкіх выданняў, фонд нотных выданняў, фонд аўдыявізуальных дакументаў; Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі: этнаграфічная калекцыя, архіў фотанегатываў, архіў вядомых беларускіх этнографаў і фалькларыстаў; Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛМ): архівы вядомых беларускіх мастацтвазнаўцаў, музыкантаў, пісьменнікаў, этнографаў і фалькларыстаў.

**IV. Справаздачнасць** прадугледжвае афармленне дзённіка і пісьмовай справаздачы па выніках вытворчай архіўнай практыкі.

## Праграма вытворчай (сцэнічнай) практыкі для студэнтаў спецыялізацыі «Этнафоназнаўства»

**I. Агульныя палажэнні.** Сцэнічная практыка скіравана на азнаямленне студэнтаў з працай аўтэнтычных або аматарскіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фальклорна-этнаграфічных калектываў. Асноўным фактарам пры выбары іх з’яўляецца тое, што асновай рэпертуару калектыву служыць рэгіянальны фальклор, а вывучэнне мастацкай і этнафанічнай традыцыі адбываецца шляхам вуснага пераймання. Падчас сцэнічнай практыкі студэнт з дапамогай кіраўніка калектыву распрацоўвае план рэканструкцыі рэгіянальнага каляндарна-абрадавага свята з дакладнай рэгламентацыяй этнафанічных фрагментаў абраду, удзельнічае ў вучэбна-рэпетыцыйнай і канцэртна-выканальніцкай дзейнасці калектыву.

**II. Мэты і задачы практыкі:** актуалізацыя тэарэтычных ведаў і практычных навыкаў, атрыманых пры вывучэнні дысцыплін «Методыка выкладання спецдысцыплін», «Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці», «Беларускі народны каляндар», «Клас фальклорна-выканальніцкага майстэрства»; азнаямленне з прынцыпамі і формамі работы фальклорнага калектыву (аўтэнтычнага, аматарскага, дзіцячага) і метадамі засваення рэгіянальных этнафанічных традыцый; удзел у арганізацыі вучэбнай, рэпетыцыйнай і канцэртнай дзейнасці фальклорнага калектыву.

**III. Базы практыкі:** размешчаныя ў Мінску і Мінскім раёне ўстановы культуры (дамы фальклору, палацы культуры, цэнтры народнай творчасці), установы адукацыі (музычныя каледжы і каледжы мастацтваў і інш.).

**IV. Справаздачнасць** прадугледжвае афармленне пісьмовай справаздачы, дзённіка і сцэнарыя рэканструкцыі каляндарна-абрадавага свята з рэпертуарным дадаткам, які ўключае этнафанічную транскрыпцыю песенных узораў.

## Чацвёрты курс
## **Вытворчая практыка (педагагічная)**

**I. Агульныя палажэнні.** Педагагічная практыка праводзіцца ў восьмым семестры на працягу месяца з адрывам ад вучэбнага працэсу. Яна скіравана на замацаванне ведаў і практычных навыкаў, набытых падчас вытворчай практыкі, аналіз творчай і вучэбна-выхаваўчай дзейнасці дзіцячых, маладзёжных калектываў фальклорна-этнаграфічнага кірунку ўстаноў адукацыі, вывучэнне педагагічных і мастацкіх прыёмаў кіраўніка калектыву, набыццё шэрагу практычных навыкаў у рабоце

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

з калектывам, арганізацыі фальклорнай дзейнасці ў межах вучэбна-выхаваўчага працэсу ўстановы.

**II. Мэты і задачы практыкі:** падрыхтоўка студэнтаў да самастойнай педагагічнай дзейнасці ў навучальнай установе, фарміраванне творчых здольнасцей і якасцей асобы будучых настаўнікаў, выпрацоўка неабходнасці ў бесперапынным удасканаленні прафесійных уменняў і творчым росце.

Практычныя заданні для студэнтаў спецыялізацыі «Этнафоназнаўства»: распрацоўка плана ўрока па музычным фальклоры, рэпертуарнага этнафанічнага зборніка з аўдыядадаткам (3–4 творы), правядзенне вучэбных заняткаў па засваенні песні, гульні і побытавага танца, правядзенне канцэртнай праграмы калектыву паводле этнафанічных узораў каляндарнага рэгіянальнага свята, рэкрэацыйна-побытавых дзей.

Практычныя заданні для студэнтаў спецыялізацыі «Абрадазнаўства»: канцэртная абрадавая (гульнявая) праграма калектыву на рэгіянальнай дакументальнай аснове, распрацоўка плана ўрока па абрадавым (гульнявым) фальклоры і сцэнарыя правядзення абрадавага свята (гульнятэкі).

**III. Базы практыкі:** сярэднія агульнаадукацыйныя школы з вывучэннем спецпрадметаў па музычным і тэатральным кірунку, цэнтры пазашкольнай работы, музычныя каледжы і каледжы мастацтваў.

**IV. Справаздачнасць** прадугледжвае два этапы. Першы этап – практычная работа. Кожны студэнт праводзіць адкрытыя заняткі з калектывам (класам, курсам), асобным вучнем на базе практыкі, падчас якой ён працуе ў якасці кіраўніка над уласнай праграмай: развучваннем песні, гульні, танца, абрадавай тэатральнай дзеі, казкі, загадак і г.д. Камісія ў складзе кіраўнікоў практыкі ад кафедры і ад базы абмяркоўвае якасць прадстаўленай праграмы, ход і выніковасць заняткаў і ацэньвае іх вынікі па 10-бальнай сістэме. Другі этап – дыферэнцаваны залік, на які студэнт прадстаўляе наступныя дакументы: пісьмовую справаздачу, у якой адлюстраваны ўсе аспекты дзейнасці творчага калектыву базавай установы, план-канспект праведзеных заняткаў з калектывам (вучнем), дзённік педагагічнай практыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пяты курс

## Вытворчая практыка (пераддыпломная)

Пераддыпломная практыка праводзіцца ў дзевятым семестры на працягу васьмі тыдняў з адрывам ад вучэбнага працэсу і скіравана на паспяховую падрыхтоўку і абарону дыпломнага праекта. Пераддыпломная практыка на спецыялізацыях «Абрадазнаўства» і «Этнафоназнаўства» мае сваю спецыфіку.

**I. Агульныя палажэнні для студэнтаў спецыялізацыі «Абрадазнаўства».** Студэнт павінен глыбока даследаваць навукова-тэарэтычную базу праблемы, над якой ён працуе, грунтоўна пазнаёміцца з дзейнасцю дзяржаўных органаў па пытаннях уліку, аховы, зберажэння, аднаўлення, выкарыстання гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь.

**II. Мэты і задачы практыкі:** вывучэнне нацыянальнага заканадаўства і міжнародных прававых актаў у галіне аховы матэрыяльнай і нематэрыяльнай культурнай спадчыны, вывучэнне дакументацыі, рэкамендаванай Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай радай па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры, якая з’яўляецца неабходнай для надання нанава выяўленаму або нанава вывучанаму нематэрыяльнаму праяўленню народнай культуры статусу і катэгорыі гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь, азнаёміцца з дзейнасцю грамадскіх арганізацый у галіне аховы матэрыяльнай і нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

**III. Базы практыкі:** аддзелы культуры мясцовых райвыканкамаў**,** раённыя, абласныя і гарадскія ўстановы культуры.

**IV. Справаздачнасць** прадугледжвае пісьмовую справаздачу аб праведзенай навукова-даследчай і арганізацыйна-метадычнай рабоце на базе практыкі, афармленне дзённіка пераддыпломнай практыкі, у якім зафіксаваны этапы праектавання дыплома.

**I. Агульныя палажэнні для студэнтаў спецыялізацыі «Этнафоназнаўства».** Студэнт павінен грунтоўна даследаваць рэгіянальную этнафанічную традыцыю, на аснове чаго напісаць дыпломны праект па мастацкім рэканструяванні ці рэстаўрацыі этнафоніі абрадавага свята.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ІІ. Мэты і задачы практыкі:** вывучэнне рэгіянальнай этнафанічнай традыцыі, яе мастацкае рэканструяванне ў аматарскім фальклорным калектыве, ўкараненне яго вынікаў у сучасным культурным жыцці грамадства ў форме святочнай падзеі (абрадавае свята, вечарына, фестываль, танцавальна-гульнявая вечарынка, мастацкая праграма і інш.).

Работа над дыпломным праектам уключае наступныя этапы:

– падрыхтоўчы (даследчы): збор этнафанічнага матэрыялу; планаванне месца і тэрміну дзеяння (на адкрытай прасторы, у абмежаванай прасторы ці ў закрытым памяшканні; пэўная дата, працягласць у часе); апісанне складу ўдзельнікаў; сцэнаграфія і драматургічнае вырашэнне абрадавага свята;

– арганізацыйна-метадычны: афармленне падабраных этнафанічных і танцавальна-гульнявых узораў у рэпертуарны зборнік або ў фанатэку; поўнае сцэнарнае праектаванне; арганізацыйна-вытворчыя пытанні рэалізацыі дыпломнага праекта;

– вучэбна-рэпетыцыйны: фарміраванне спеўных гуртоў – ілюстратараў этнафоніі абрадавага свята (фальклорныя калектывы ўстаноў культуры і адукацыі, мясцовыя жыхары вёскі, горада); развучванне з імі песень, гульняў і танцаў са сфарміраванага рэпертуарнага зборніка шляхам вуснага навучання з выкарыстаннем этнафанічных транскрыпцый песень;

– творчы этап: мастацкая рэканструкцыя абрадавай і рэкрэацыйнай (танцавальна-гульнявой) этнафанічнай практыкі ў форме арганізаванага фальклярызаванага свята;

– навукова-аналітычны: напісанне дыпломнага праекта.

**ІІІ. Базы практыкі:** раённыя, абласныя і гарадскія ўстановы культуры і адукацыі.

**IV. Справаздачнасць** прадугледжвае праграму мастацкай рэканструкцыі ці рэстаўрацыі абрадавай і пазаабрадавай этнафоніі, абрадавую карту кодаў свята, сцэнарый рэканструкцыі ці рэстаўрацыі абрадавага свята, запіс этнафанічнага матэрыялу і сістэматызацыя яго ў форме рэпертуарнага зборніка з аўдыя-, відэададаткам (у адпаведнасці з архіўнымі патрабаваннямі), этнафанічную транскрыпцыю адабраных песенных узораў, дзённік вытворчай пераддыпломнай практыкі, у якім зафіксаваны этапы праектавання дыплома.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Абавязкі студэнтаў-практыкантаў:

– студэнт-практыкант рэгулярна працуе на базу практыкі;

– выконвае ўсе віды работ, прадугледжаных праграмай практыкі;

– падпарадкоўваецца правілам унутранага распарадку ўстановы адукацыі і культуры і распараджэнням арганізатараў і кіраўнікоў практыкі;

– студэнт-практыкант абавязаны своечасова і ў поўным аб'ёме здаць справаздачу.

### Дакументацыя, улік і ацэнка практыкі студэнтаў

**Дакументацыя** ўключае наступныя састаўляючыя: дзённік практыкі ўстаноўленага ўзору, у якім фіксуецца змест даследчай дзейнасці, назіранні за рэпетыцыямі і канцэртамі, ходам вучэбных заняткаў і пазакласнай дзейнасці, заўвагі і даручэнні кіраўнікоў практыкі, дадзеныя пра выкананне праграмных заданняў; пісьмовую справаздачу, у якой у сціслай форме выкладаецца вынік практыкі. Таксама дакументацыя ўключае асобныя матэрыялы (праграма свята, сцэнарый, этнафанічная расшыфроўка і інш.), апісаныя вышэй. **Улік** практыкі студэнтаў ажыццяўляюць кіраўнік практыкі ад кафедры ўніверсітэта, кіраўнік практыкі ад прадпрыемства, стараста вучэбнай групы (пры магчымасці). **Ацэнка** практыкі адбываецца на спецыяльным пасяджэнні кафедры ў форме дыферэнцаванага заліку з удзелам кіраўнікоў практыкі.

### Абавязкі кіраўнікоў практыкі

*Кіраўнік практыкі ад прадпрыемства:*

– знаёміць студэнтаў з планам работы прадпрыемства, калектыву (класа);

– кансультуе пры падрыхтоўцы правядзення заняткаў, рэпетыцый:

– правярае канспекты, планы заняткаў;

– удзельнічае ў працэсе аналізу і ацэнкі заняткаў, праведзеных студэнтамі;

– зацвярджае справаздачу студэнтаў;

– падпісвае дзённік праходжання практыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Кіраўнік практыкі ад кафедры ўніверсітэта:*

– праводзіць інструктаж аб праходжанні практыкі і ахове працы ў замацаванай за ім групе;

– сочыць за абавязковым наведваннем баз практыкі;

– правярае дакладнасць вядзення дзённікаў;

– рыхтуе заключную справаздачу, у якой робіць аналіз паспяховасці рэалізацыі пастаўленых задач;

– падводзіць вынікі і адзначае прапановы па ўдасканаленні вытворчых і метадычна-арганізацыйных аспектаў практыкі.

**Патрабаванні да зместу і афармлення асабістага задання і справаздачы па практыцы. Змест** асабістага задання, якое дае студэнту кіраўнік практыкі ад кафедры ўніверсітэта, павінен канцэптуальна адпавядаць задачам, сфармуляваным у п. II кожнага раздзела дадзенай праграмы. Пры гэтым асабістае заданне павінна ўлічваць індывідуальныя асаблівасці, творчыя здольнасці і навуковыя зацікаўленні студэнта-практыканта і быць добра зразумелым яму. **Змест** справаздачы па практыцы адлюстроўвае час, месца, характар выкананай студэнтам даследчай, метадычнай, педагагічнай ці творчай працы на базе практыкі. **Афармленне** асабістага задання і справаздачы павінна адпавядаць нормам літаратурнай мовы, выконвацца без выпраўленняў і купюр. Пры афармленні асабістага задання і справаздачы ўказваюцца поўныя назвы дзяржаўных устаноў, якія служылі базамі практыкі, і поўныя назвы пасад тых службовых асоб, якія кіравалі практыкай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЛІТАРАТУРА

1. *Беларускі* фальклор у школе. 1-ы клас : дапаможнік для настаўніка / І. І. Сучкоў [і інш.]. – Мінск : Нар. асвета, 1996. – 176 с.

2. *Бяркові́ч, Т.* На стыку практычнай і тэарэтычнай этнамузыкалогіі: Фонаархіў этнамузыкі БДАМ / Т. Бяркові́ч // Музычная культура Беларусі і свету : да 100-годдзя Л. С. Мухарынскай / склад. Т. С. Якіменка; навук. працы Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Вып. 12. Сер. 1, Беларуская музычная культура. – Мінск : Беларус. дзярж. акадэмія музыкі, 2006. – С. 103–123.

3. *Варфаламеева, Т. Б.* Ахова і захаванне нематэрыяльнай культурнай спадчыны як сфера сацыяльна-культурнай палітыкі беларускай дзяржавы на сучасным этапе: праблемы і перспектывы / Т. Б. Варфаламеева // Аўтэнтычны фальклор: праблемы бытавання, вывучэння, перайманя: матэрыялы навук.-метад. канф. (15–16 сак. 2007 г.) / рэдкал. : М. Л. Кузьмініч (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2007 – С. 131–138.

4. *Калацэй, В.В.* Нарматыўна-прававыя аспекты дзейнасці па захаванні фальклору і этнакультурным выхаванні / В. В. Калацэй // Палявая фалькларыстыка і этналогія : даследаванне лакальных культур Беларусі / уклад. І. Ю. Смірнова. – Мінск : БДУКМ, 2008. – С. 223–228.

5. *Караткевіч, А. А.* Асноўныя накірункі вытворчай практыкі студэнтаў факультэта мастацкай творчасці / А. А. Караткевіч // Павышэнне эфектыўнасці практыкі студэнтаў як асноўнага сродку прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў : матэрыялы навук.-метад. семінара (кастр. 1997 г.). – Мінск : Беларус. ун-т культуры, 1999. – С. 20–23.

6. *Кузьмініч, М. Л.* Стандарт па спецыяльнасці «Народная творчасць (фальклор)» як мадэль падрыхтоўкі кадраў для галіны традыцыйнай народнай культуры / М. Л. Кузьмініч // Аўтэнтычны фальклор: праблемы бытавання, вывучэння, перайманя: матэрыялы навук.-метад. канф. (15–16 сак. 2007 г.) / рэдкал. : М. Л. Кузьмініч (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2007. – С. 3–19.

7. *Марозава, Т.* Арганізацыя архіўнай работы ў вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору БДУ / Т. Маро-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зава // Фальклярыстычныя даследаванні. Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі : зб. арт. Вып. 7 / пад навук. рэд. Р. М. Кавалёвай, В. В. Прыемка. – Мінск : РІВШ, 2010. – С. 320–329.

*8. Марозава, Т.* Фальклорны практыкум як форма падрыхтоўкі студэнтаў-філолагаў да вучэбнай практыкі / Т. Марозава // Фальклярыстычныя даследаванні. Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі : зб. арт. Вып. 6 / пад навук. рэд. В. В. Прыемка, Т. А. Марозавай. – Мінск : Бестпрынт, 2009. – С. 300–304.

*9. Нарматыўнае* вытворча-практычнае выданне «Нарматыўна-прававыя дакументы па праблемах арганізацыі аматарскай творчасці». Вып. 4. – Мінск : БелІПК, 1999. – 25 с.

*10. Организация* и проведение психолого-педагогической практики со студентами высших учебных заведений : метод. рекомендации / сост. Н. Д. Джига. – Минск : БГПУ, 2002. – 21 с.

*11. Практыка* як састаўная частка прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў для сацыякультурнай сферы : матэрыялы рэсп. навук.-метад. канф. (1–2 лют. 2000 г.) / рэдкал. : А. І. Смолік [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2000. – 203 с.

*12. Урбанавичене, Д.* Архивы этномузыки: проблемы и перспективы / Д. Урбанавичене // Славянская этнамузыкология : Направления. Методы. Концепции : тез. докл. Междунар. науч. конф. к 90-летию Л. С. Мухаринской (1906–1996). – Минск : Белорус. гос. академия музыки, 1996. – С. 90–92.

*13. Хвір, Н. Д.* Нематэрыяльная спадчына Беларусі / Н. Д. Хвір // Палявая фалькларыстыка і этналогія : даследаванне лакальных культур Беларусі / уклад. І. Ю. Смірновай; пад рэд. В. А. Лабачэўскай. – Мінск : БДУКМ, 2008. – 34 с.

*14. Этномузыкология.* Специальность 070112 (054000). Примерные программы дисциплин. Государственный образовательный стандарт. Примерный учебный план. Требования к материально-техническому обеспечению : сборник учебно-методических материалов и нормативных документов. – СПб. : Шатон, 2005. – 668 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ДАДАТКІ

*Дадатак 1*

**Пашпарт**
**фальклорнай адзінкі**
(*жанр і назва твора*)

______________________________________________________________
______________________________________________________________
______________________________________________________________

Запіс зроблены ад фальклорнага гурту (носьбіта)
________________________________________________
________________________________________________
вёскі ___________________________________________
раёна __________________________________________
вобласці________________________________________

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатак 2*

**Пашпарт творчага калектыву**

Назва калектыву_________________________________________
Адрас_______________________________________________
Год стварэння_________________________________________
Від творчай дзейнасці ____________________________________
Колькасць і ўзрост удзельнікаў ____________________________
Мастацкі кіраўнік_______________________________________
Іншыя звесткі (рэпертуарная палітыка, канцэртная дзейнасць, удзел у фестывалях і конкурсах)___________________________
_______________________________________________________
_______________________________________________________
_______________________________________________________

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатак 3*

# Этнафанічная транскрыпцыя песеннага ўзору (прыклад)

*Купальская песня «Як на Йвана» вёскі Багатырская Полацкага раёна Віцебскай вобласці*




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| Фальклорны тэкст | Этнафанічная транскрыпцыя |
|---|---|
| | **Дыяпазон** – рэ 1 - ля 1→сярэдні рэгістр з захопам верхняга<br>**Стыль інтанавання** – антыфонны тып суладдзя галасоў на бурдоннай аснове, з інварыянтамі канона<br>**Дынаміка** – гучна ***(f)***<br>**Тэмп** – умераны<br>**Рэзанатарная сістэма** – рэзанатары ротаглоткавы, цвёрдае паднябенне<br>**Пеўчая пазіцыя** – заднеязычная<br>**Агульная артыкуляцыйная ўстаноўка** – **О** сярэднеязычнае<br>**Тып інтанавання** – рэчытатыўна-вакальны→ характар голасавядзення – штуршкова-плаўны<br><br>**Варыяцыі артыкуляцыйных укладаў прапяваемых фанем** |

| | |
|---|---|
| Як на Йвана,<br>Як на Йвана сонца йграла,<br>Сонца йграла. | Як-га***о***к на Йвана***о***-га***о***,<br>Як на Йвана***о*** сон(ы***э***)ца***э*** йгра-га-ла***о***,<br>Со-го-нца***э*** йгра-га-ла***о***. |
| А там дзеўка,<br>А там дзеўка цвяты рвала,<br>Цвяты рвала. | А-га там(ы***э***) дзеўка***о***-га***о***,<br>А там(ы***э***) дзеў***о***ка***о*** цвяты***э*** рва-га-ла***о***,<br>Цвя-га-ты***э*** рва-га-ла***о***. |
| Цвяты рвала,<br>Цвяты рвала, вянкі віла,<br>Вянкі віла. | Цвя-га-ты***э*** рвала***о***-га***о***,<br>Цвяты***э*** рвала***о***, вян(ы***э***)кі***е*** ві***е***-ге-ла***о***,<br>Вя-га-н(ы***э***)кі***е*** ві***е***-ге-ла***о***. |
| Старшым дзеўкам,<br>Старшым дзеўкам па вяночку,<br>Па вяночку. | Ста-га-ршы***э***м(ы***э***) дзеў***о***ка-гам,<br>Старшы***э***м(ы***э***) дзеў***о***кам(ы***э***) па вяно-го-чку***о***,<br>Па-га вяночку***о***. |
| Младшым дзеўкам,<br>Младшым дзеўкам па цвяточку,<br>Па цвяточку. | Мла-га-дшы***э***м(ы***э***) дзеў***о***ка***о***-га***о***м,<br>Младшы***э***м(ы***э***) дзеў***о***ка***о***м(ы***э***) па цвято-го-чку***о***,<br>Па-га цвяточку***о***. |
| Старшы дзеўкі,<br>Старшы дзеўкі замуж пойдуць,<br>Замуж пойдуць. | Ста-га-р***э***шы***э*** дзеў***о***кі***е***-ге,<br>Стар***э***шы***э*** дзеў***о***кі***е*** заму***о***ж по-гой-ду***о***-го-ць,<br>За-га-муж(ы***э***) пой***э***ду***о***ць. |
| Младшы дзеўкі,<br>Младшы дзеўкі гуляць будуць,<br>Гуляць будуць. | Мла-га-д***э***шы***э*** дзеў***о***кі***е***-ге,<br>Млад***э***шы***э*** дзеў***о***кі***э*** гу***о***ляць бу***о***-го-ду***о***-гоць,<br>Гу***о***-го-ляць бу***о***ду***о***ць. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ПРАГРАМА**
**ВУЧЭБНАЙ І ВЫТВОРЧАЙ ПРАКТЫКІ**
*па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць,*
*напрамку 1-18 01 01-05 Фальклор,*
*спецыялізацый 1-18 01 01-05 01 Абрадазнаўства*
*і 1-18 01 01-05 02 Этнафоназнаўства*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк .2013. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,16. Ул.-выд. арк. 0,72. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
ЛИ № 02330/0003939 ад 19.05.2011.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ